УДК 94 (476) (XVIII ст. – пач. XX ст.)

# НАКІРУНКІ ЗАКАНАДАЎЧАЙ РЭГЛАМЕНТАЦЫІ ДЗЕЙНАСЦІ ЎСТАНОЎ ГРАМАДСКАГА ХАРЧАВАННЯ Ў КАНЦЫ XVIII – ПАЧАТКУ XX СТЯГОДДЗЯЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

*Л.Ф. ВІКОЛ*
*(Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей)*

*Разгледжаны галоўныя напрамкі заканадаўча-прававой рэгламентацыі дзейнасці ўстаноў грамадскага харчавання ў канцы XVIII – пачатку XX стст. на тэрыторыі Беларусі. Заканадаўчае рэгуляванне падзелена на два этапы ў рамках акрэсленай храналогіі. На першым этапе (канец XVIII – першая палова XIX стст.) грамадскае харчаванне развівалася пад уплывам палітычнага фактара, звязанага з уваходжаннем беларускіх тэрыторый у склад Расійскай Імперыі. У гэты час адбываецца адаптацыя дзейнасці пунктаў харчавання да агульнарасійскіх нормаў. На другім этапе (другая палова XIX – пачатак XX стст.) падрабязна вызначаюцца санітарна-гігіенічныя патрабаванні да ўтрымання ўстаноў харчавання, уніфікуецца іх знешняя і ўнутраная атрыбутыка. Рэгламентацыі падлягае арганізацыя рэкрэацыі, лакалізацыя ўстаноў харчавання на мясцовасці, сацыяльны склад іх наведвальнікаў і рэжым працы. Умацоўваецца роля паліцыі ў забеспячэнні законнай дзейнасці пунктаў харчавання.*

***Ключавыя словы***: *сістэма грамадскага харчавання, установы харчавання, рэгуляванне і кантроль дзейнасці, Вялікае Княства Літоўскае, Расійская Імперыя.*

**Уводзіны**. Грамадскае харчаванне з’яўляецца галіной народнай гаспадаркі па вытворчасці і рэалізацыі гатовай ежы насельніцтву праз сетку сталовых, кафэ, рэстаранаў, буфетаў. Яно займае важнае месца ў эканамічнай і сацыяльна-культурнай сферы жыцця соцыуму [1, с. 397]. Грамадскае харчаванне на тэрыторыі Беларусі мае свае гістарычныя асаблівасці фарміравання і развіцця, а таксама прызначэнне, якое заключаецца ў задавальненні патрэб насельніцтва ў ежы, камунікацыі, адпачынку. Вывучэнне працэсаў фарміравання і развіцця сістэмы харчавання ў айчыннай гістарыяграфіі мае фрагментарны характар. Гэтыя працэсы разглядаюцца ў нешматлікіх публікацыях і ў раздзелах некаторых кніг, дзе найчасцей раскрываюцца асобныя аспекты гісторыі корчмаў [2–11]. Мэтай дадзенага артыкула выступае аналіз накірункаў заканадаўча-прававой рэгламентацыі дзейнасці пунктаў харчавання на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX стст. з вызначэннем існаваўшых парушэнняў у дадзенай сферы і ролі паліцыі ў кантролі за законным функцыянаваннем гэтых устаноў. Пастаўленую мэту дапамагае раскрыць шырокая група гістарычных крыніц.

**Асноўная частка**. Перад тым як разгледзіць працэс афармлення сістэмы грамадскага харчавання ў XIX – пачатку XX стст., варта звярнуцца да больш ранняга перыяду XVI–XVII стст., калі толькі закладваюцца асноўныя структурныя элементы сістэмы харчавання на тэрыторыі Беларусі. Да такіх структурных элементаў адносяцца: законы па рэгуляванню і кантролю дзейнасці сферы грамадскага харчавання, уласна пункты харчавання (корчмы, шынкі, аўстэрыі і інш.), катэгорыі іх кліентаў і ўласнікаў.

Станоўчым фактарам, які паўплываў на развіццё сістэмы харчавання, стаў устойлівы дэмаграфічны рост на працягу першай паловы XVII ст. У час войнаў рост насельніцтва, адпаведна, запавольваўся. Наступная хваля дэмаграфічнага ўздыму прыпадае на 1730-ыя гг. і працягвалася да апошняга падзелу Рэчы Паспалітай у 1795 г. [12, с. 57]. Рост колькасці насельніцтва прыводзіў да заканамернага павелічэння колькасці кліентаў корчмаў. Спрыяльна адбілася на пашырэнні сеткі пунктаў харчавання ўвядзенне магдэбургскага права, якое давала гарадам падатковыя льготы і льготы ў рамеснай і гадлёвай дзейнасці, права валодання гарадской зямлёй і інш. [13, с. 94]. Узнікненне сеткі корчмаў таксама было звязана з эканамічным ростам у Вялікім Княстве Літоўскім. У XVI ст. расце колькасць гарадскіх паселішчаў, развіваюцца рамяство і гандаль. Гэтыя фактары спрыялі таму, што корчмы сталі засноўваць на важных гандлёвых шляхах, на гарадскіх плошчах. У такіх умовах трымаць карчму было выгадна. У сувязі з гэтым узнікае заканамерная неабходнасць упарадкавання і рэгламентацыі гэтай сферы на высокім дзяржаўным ўзроўні.

Асновы заканадаўчага афармлення дзейнасці ўстаноў грамадскага харчавання былі закладзены яшчэ ў XVI ст. з выпрацоўкай адпаведных артыкулаў у Статутах ВКЛ (1529, 1566, 1588 гг.), ва «Уставе на валокі» (1557 г.), каралеўскіх прывілеях і ўніверсалах [14–18]. Увага дзяржавы да функцыянавання корчмаў і шынкоў сведчыць аб тым, што гэтыя ўстановы ў адзначаны перыяд часу пачалі адыгрываць важнае значэнне ў эканамічным жыцці княства. Палажэннямі Статутаў рэгламентаваўся гандаль спіртным, але у першую чаргу, выпрацоўваліся палажэнні, якія пераследавалі тайны збыт алкагольнай прадукцыі. У дакументах рабіліся спробы рэгламентаваць грамадскі парадак, звязаны з дзейнасцю корчмаў, якія не павінны былі з’яўляцца спрыяльнымі месцамі для злачынстваў. Увага дзяржавы ўлічвала і тое, што такія ўстановы мелі спажывецкія функцыі, таму разумела неабходнасць адкрыцця корчмаў на шляхах зносін.

Адзінага органу кантролю і кіравання корчмы не мелі. У гарадах яны падпарадкоўваліся органам гарадскога кіравання і самакіравання. У прыватнаўласніцкіх гарадах і мястэчках такія ўстановы падпарадкоўваліся волі іх уласніка. У сельскай мясцовасці на прыватнаўласніцкіх землях корчмамі кіраваў землеўласнік, які здаваў іх у арэнду. Рэгламентацыя дзейнасці корчмаў у ВКЛ грунтавалася на законе, які даваў магчымасць эфектыўна атрымліваць падаткі на карысць дзяржавы і, у той жа час, стымуляваць адкрыццё корчмаў. Так, можна лічыць, што менавіта ў XVI–XVII стст. ідзе актыўны працэс развіцця сістэмы грамадскага харчавання.

У канцы XVIII ст. пачынаецца новы перыяд у гісторыі Беларусі, звязаны з трыма падзеламі Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795 гг.), у выніку якіх да Расійскай Імперыі адыйшла амаль уся этнічная беларуская тэрыторыя. Час уваходжання беларускіх зямель у склад расійскай дзяржавы стаў перыядам распаўсюджвання розных тыпаў устаноў грамадскага харчавання, абагульнення, удасканальвання, выпрацоўкі новага заканадаўства ў адзначанай сферы, вызначэння кампетэнцый органаў мясцовага кіравання і кантролю.

У першай палове XIX ст. абдываецца адаптацыя дзейнасці ўстаноў грамадскага харчавання да агульнарасійскіх нормаў. Ва ўмовах пошуку і наладжвання шляхоў развіцця сацыяльнага і эканамічнага жыцця, корчмы, як першы тып установы харчавання, паступова страчваюць сваю важную грамадскую і сацыяльную ролю, якую адыгрывалі ў XVI–XVIII стст. У другой чвэрці XIX ст. дзейнасць корчмаў залежыць ад продажу алкаголю, вытворчасць якога значна ўзрасла ў сувязі з пачаткам вырабу спірту з бульбы. У такіх умовах карчма і шынок сталі для памешчыка галоўнымі пунктамі збыту алкаголю [19, арк. 34–67].

У першай палове XIX ст. выпрацоўваюцца кампетэнцыі органаў кіравання і нагляду за сістэмай грамадскага харчавання, якая на беларускіх землях падлягала рэгламентацыі з боку губернскай улады. У гарадах шырокія паўнамоцтвы мелі гарадскія думы. Яны распрацоўвалі «Обязательные постановления», у якіх падрабязна рэгламентавалася дзейнасць устаноў харчавання. На паседжаннях гарадскіх дум абмяркоўвалася магчымасць на дазвол адкрыцця таго ці іншага тракціра. За дзейнасцю пунктаў харчавання назіраў штат паліцыі, на які быў ускладзены шэраг функцый па кантролю за парадкам у піцейных установах [20, арк. 1].

Да вызначальных дакументаў агульнадзяржаўнага характару першай паловы XIX ст., што рэгламентавалі сферу дзейнасці піцейных устаноў і продаж спіртнога, варта аднесці распрацаваныя ў 1842 г. і зацверджаныя ў 1843 г. «Правила о продаже горячих напитков в Губерниях и областях, где существует вольная оным продажа, по определённым ценам» [21], «Положения 4 июля сего года, Высочайше утверждённое об акцизе с заведений и мест раздробительной продажи горячих напитков в Губерниях, где существует вольная оным продажа» [21]. Дзеянне палажэнняў распаўсюджвалася на ўласна расійскія губерні, а таксама на Мінскую, Магілёўскую, Віцебскую, Віленскую, Гродзенскую губерні [21, арк. 1].

Асноўнымі пунктамі выдадзеных законаў былі:

1) рэгламентацыя коштаў на алкагольную прадукцыю («в настоящих правилах определяется одна нормальная цена, ниже которой горячие напитки не могут быть продаваемы в одной из поименованных губерний или областей» [21, арк. 2]; 2) упарадкаванне акцызнай (падатковай) сістэмы ў сферы продажу спіртнога; 3) арганізацыя збору звестак аб колькасці ўстаноў тракцірнага промыслу, дзе гандлявалі спіртным; 4) усталяванне абавязковых правілаў дзейнасці ўстаноў «раздробительной продажи горячих напитков»; 5) вызначэнне сістэмы штрафаў і пакаранняў за безакцызны гандаль спіртным [21, арк. 2].

Былі выпрацаваны дакладныя правілы функцыянавання ўстаноў рознічнага гандлю спіртным. Да іх адносіліся наступныя: 1) рознічны продаж спіртнога ў сельскай мясцовасці дазваляўся толькі да 11-й гадзіны вечара; 2) у тых населеных пунктах, дзе былі цэрквы, распівачны продаж забараняўся пакуль не скончыцца літургія і падчас хрэснага ходу; 3) забаранялася прадаваць віно ў пазыку альбо пад заклад уласных рэчаў ці на кошт будучага ўраджаю; 4) за дамешак шкодных рэчываў да напіткаў вызначалася пакаранне. Нагляд за выкананнем вышэй пералічаных артыкулаў быў ускладзены на ўездныя камітэты. Была вызначана падрабязная сістэма штрафаў за парушэнні вышэйадзначаных правілаў, у тым ліку за завышэнне ці заніжэнне коштаў на спіртное [21, арк. 5].

У законе «Положение 4 июня сего года Высочайше утвержденное, об акцизе с заведений и мест раздробительной продажи» вызначалася класіфікацыя «мест раздробительной продажи» і правілы патэнтнага гандлю спіртным, выпрацоўвалася сістэма штрафаў за парушэнні ў карыстанні патэнтамі [21]. З увядзеннем новых коштаў на спіртныя напіткі і з прыстасаваннем сістэмы грамадскага харчавання да новых умоў паўстала задача ўніфікацыі мераў вагі і аб’ёмаў [22, арк. 1].

Такім чынам, законы азначанага перыяду ўтрымлівалі пераважна меры па структурнай арганізацыі органаў кіравання ў сферы дзейнасці ўстаноў грамадскага харчавання, па выпрацоўцы спосабаў кантролю за іх дзейнасцю, па вызначэнні нормаў акцызу на спіртное. Робяцца спробы класіфікацыі ўстаноў грамадскага харчавання для больш эфектыўнага кіравання імі [23, с. 150–159].

У другой палове XIX ст. распрацоўваліся палажэнні, накіраваныя на дэталёвую рэгламентацыю ўсіх бакоў дзейнасці пунктаў грамадскага харчавання. На гэты час прыпадае шэраг спроб рэгламентаваць

і кантраляваць санітарна-гігіенічныя нормы дзейнасці піцейных установ. Пераадольванне наступстваў антысанітарыі было накіравана на абарону спажыўцоў ад інфекцыйных захворванняў, а таксама захворванняў, выкліканых няправільным прыгатаваннем і захоўваннем ежы, утрыманнем кухоннага інвентару.

У 1861 г. выходзіць «Положение о трактирных заведениях» [24]. Адпаведна пункту 39 «Положения» стравы, што падаваліся ў трактірах, павінны гатавацца са свежых прадуктаў, а напіткі – без шкодных дамешкаў [24, арк. 16]. У раздзеле «О взысканиях с содержателей трактирных заведений» сярод пунктаў, за што ўладальнік піцейнай установы мог быць аштрафаваны, называецца продаж сапсаваных і шкодных для здароўя прадуктаў [24, арк. 16]. Уладальнік тракціра сачыў за чысцінёй і парадкам [24, арк. 17].

У 1861 г. Аляксандр II падпісаў «Положение о питейном сборе» [24]. У пункце 270 «Положения» замацоўвалася неабходнасць утрымліваць чысціню і ахайнасць ва ўсіх месцах рознічнага гандлю спіртным [24, арк. 268]. У пункце 361 «Устава о питейном сборе» ад 1879 г. напаміналася аб захаванні чысціні ва ўсіх месцах продажу крэпкіх напіткаў [25, арк. 163]. У 1885 г. Міністэрства фінансаў распрацавала «Правила о раздробительной продаже крепких напитков». У пункце 43 гэтага дакумента таксама нагадвалася аб захаванні ва ўсіх установах тракцірнага промыслу чысціні, парадку, ахайнасці [26, арк. 36]. У «Положении о трактирном промысле» ад 1893 г. падкрэслівалася неабходнасць дбаць аб выкананні санітарных нормаў [26, арк. 14].

У дакументах вышэйшых органаў улады пры рэгламентацыі санітарна-гігіенічных нормаў найчасцей указвалася на неабходнасць «соблюдать чистоту и опрятность». Мясцовым органам улады (губернатарам, губернскім акцызным ведамствам, гарадскім думам) надаваліся шырокія паўнамоцтвы ў праве прымаць нарматыўна-прававыя акты, у якіх дэталёва распісваліся санітарна-гігіенічныя патрабаванні. У шматлікіх інструкцыях вызначаліся патрабаванні да стану здароўя работнікаў тракцірных установ, нормы ўтрымання памяшканняў, захоўвання і рэалізацыі прадуктаў харчавання, патрабаванні да прылеглай тэрыторыі [27, арк. 3–44].

З 1886 г. планавалася ўвесці «санітарныя сшыткі», у якіх меркавалася адлюстроўваць заўвагі аб парушэннях падчас агляду тракцірнай установы. Сістэматычнага выкарыстання такія сшыткі ў гэты час не атрымалі, хаця ў пачатку XX ст. у некаторых піцейных установах Мінска іх наяўнасць стала абавязковай умовай, у тым ліку для фіксацыі стану здароўя работнікаў установ харчовага ведамства [28, арк. 224].

Рэгламентацыі з боку мясцовых органаў улады падлягаў спосаб гандлю прадуктамі харчавання. Прыкладам могуць стаць праекты Сакольскай гарадской думы (Гродзенская губерня). Паводле пастаноў ад 1879 г. і 1892 г. на вуліцах, каля тратуараў і паромных пераправаў забаранялася прадаваць з адкрытых столікаў хлеб, булкі, гародніну, садавіну, ягады. На базарных плошчах прадукты маглі прадавацца толькі са сталоў з навесамі, сам тавар павінен быў прыкрывацца чыстымі абрусамі ад запыленасці. Гародніну і зяляніну, якую ў летні час прадавалі з зямлі, прадпісвалася ўкладваць на посцілках ці брызенце, закрываць абрусамі ад пылу і насякомых [29, арк. 71]. Пункт 36 «Обязательных постановлений» Лідскай гарадской думы ад 1893 г. прадпісваў, каб усе прыпасы і гатовыя стравы ва ўстановах грамадскага харчавання былі свежымі і добрай якасці [30, арк. 44].

Гарадскія думы ў «Обязательных постановлениях» дэталёва рэгламентавалі нормы санітарыі. Так, Мінская гарадская дума ў 1901 г. дзеля захавання патрэбнай чысціні забараніла адчыняць кандытарскія, булачныя, хлебапякарні ў сырых і нізкіх падвальных памяшканнях. Сценкі і столь, паводле распрацаваных патрабаванняў, атынкоўвалі, а падлогу сцялілі бетоннай, асфальтаванай альбо драўлянай, без шчылінаў. Сценкі рэкамендавалася вычышчаць ад павуціння, пылу, а потым выбельваць. Рабочыя мусілі чыста апранацца, мець чыстыя фартухі і каўпакі на галовах. Асобы з высыпкамі, нарывамі, язвамі на целе да работы не дапускаліся, так як і «страдающие заразительными болезнями, каковы например: сифилис, чахотка и прочие» [31, арк. 16]. Прадаўцам забаранялася браць голымі рукамі кандытарскія вырабы. Не дазвалялася трымаць у памяшканнях катоў, сабак і птушак. За ахайным выглядам і станам здароўя сваіх работнікаў сачыў уладальнік установы [32, арк. 16].

Гродзенскі губернатар падпісаў у 1905 г. «Обязательные постановления по содержанию трактиров и постоялых дворов». Пакоі для кліентаў прадпісвалася рэгулярна праветрываць і прыбіраць. Вызначалася неабходнасць строга захоўваць чысціню на кухнях. Служачым забаранялася спаць ці жыць на кухнях, трымаць там рэчы, не звязаныя з прыгатаваннем ежы. Прыпасы мусілі быць свежымі, захоўвацца ў чыстым посудзе, а пры выстаўленні на стойках ці прылаўках павінны прыкрывацца ад насякомых і пылу. Двары пры тракцірных установах таксама трэба было ўтрымліваць у чысціні [33, арк. 171]. Яны павінны былі мець «надлежащее устроенные отхожие места, помойные ямы или мусорные ящики» [33, арк. 171].

З рапартаў і даносаў паліцыі становіцца відавочным, што часта сустракаліся грубыя парушэнні. Абавязак сачыць за чысцінёй ускладваўся на ўладальнікаў піцейных установ, якія не заўсёды добрасумленна адносіліся да гэтага. Паліцыя таксама кантралявала стан утрымання піцейных установ. Яна рабіла спецыяльныя рэйды для выяўлення парушэнняў, рэагавала на даносы. Яскравым прыкладам стала справа «О закрытии булочной и кондитерской турецкого подданного Офли» [34, арк. 3–20]. З-за антысанітарыі

была зачынена піўная лаўка ў вёсцы Гарадзішча Горацкага ўезда: «…означенная пивная лавка содержится крайне грязно, служит для сборища пьяных крестьян и является местом всяких бесчинств» [32, арк. 12]. У 1896 г. у Гродне быў зачынены тракцір К. Васілеўскага, бо выявілася, што «трактирное заведение содержится крайне неудовлетворительно» [35, арк. 11]. Антысанітарыя стала падставай для закрыцця піцейнай установы ў вёсцы Дварцы Слонімскага ўезда. З пратакола стала вядома, што ў пакоях тракціра было брудна, сталы для наведвальнікаў стаялі непрыбраныя і непакрытыя спецыяльнымі абрусамі, гарачая ежа не гатавалася, а на кухні нават не было для гэтага посуду [35, арк. 15].

Рэгламентацыя асноўных патрабаванняў да інтэр'еру і экстэр'еру піцейных устаноў суседнічала з выпрацоўкай санітарна-гігіенічных нормаў. Галоўным зместам эстэтычнага аблічча ўстаноў харчавання заставаліся чысціня і парадак.

Пры арганізацыі інтэр'еру і экстэр'еру ўстановы харчавання яе уладальнік мог праяўляць уласны густ і фантазію, але вымушаны быў прытрымлівацца пэўных прынцыпаў і патрабаванняў, галоўнымі з якіх былі функцыянальнасць і адпаведнасць свайму прызначэнню. Забаранялася мець патаемныя памяшканні, склады, пераходы, дзверы і вокны ў мэтах прадухілення незаконнага гандлю спіртным, які мог здзяйсняцца ў недазволены час у іншым памяшканні, без агляду і без вокнаў [36, арк. 4]. Паводле «Положения о питейном сборе» ад 1861 г. замацоўвалася мець у піцейным доме толькі адзін пакой на ніжнім паверсе з выхадам на вуліцу [28, арк. 20].

Неабходным элементам атрыбутыкі ўстановы тракцірнага промыслу была шыльда [26, арк. 17]. У пункце 40 «Положения о трактирном промысле» прадпісвалася кожнай тракцірнай установе мець карты з абазначэннем коштаў на тавары і паслугі [37, арк. 16]. Памяшканні павінны былі добра асвятляцца, мець надзейныя вокны і дзверы. У мэтах прадухілення крадзяжоў уладальнік пункта харчавання арганізоўваў унутраны кантроль, клапаціўся аб наяўнасці моцных засовак і замкоў на дзвярах [37, арк. 16].

У 1883 г. распараджэннем мінскага губернатара было забаронена мець у корчмах партрэт імператара Аляксандра III. Дадзеная мера была прынята пасля даклада Міністра ўнутраных спраў ад 1875 г. аб неабходнасці забараніць вывешваць у тракцірах партрэты імператара і імператарскай сям'і: «…если открыто будет, что означенные портреты окажутся в трактирных заведениях, то предписываю о виновных составить акты и передавать мировым судьям» [38, арк. 1].

Рэгламентацыя лакалізацыі ўстаноў грамадскага харчавання на мясцовасці вырашалася з улікам шчыльнасці насельніцтва, тыпу мясцовасці (гарадская або сельская), аддаленасці ад культавых і адукацыйных арганізацый. Рост колькасці і тыпавой разнастайнасці ўстаноў грамадскага харчавання адсочваўся для забеспячэння парадку і законнасці ў дадзенай сферы. Законам другой паловы XIX ст., які агаворваў парадак вызначэння колькасці ўстаноў харчавання, стала «Положение о трактирных заведениях» (глава «О местах раздробительной продажи питей», 1861 г.) [37]. Установы піцейнага промыслу адчыняліся ў любым населеным месцы. Адкрыццё корчмаў і пастаялых двароў дазвалялася і ў ненаселеных месцах: ля праезжых дарог, рачных пераправаў і прыстаняў [37, арк. 1–2]. Забаранялася ладзіць піцейныя ўстановы ў адным будынку са школамі ці гімназіямі, турмамі, казармамі, а таксама бліжэй за 40 сажняў (84 метры) ад могілак, цэркваў і манастыроў [37, арк. 1–2].

Блізкае размяшчэнне пунктаў продажу спіртнога стварала нязручнасці для навучальных, культавых устаноў і іншых арганізацый. У 1856 г. камандзір кадэцкага корпуса генерал-лейтэнант Гальштэран у хадатайніцтве на імя гродзенскага губернатара прасіў зачыніць шынок, што знаходзіўся паблізу кадэцкага лагера. Аўтар ліста абураецца тым фактам, што «…в шинке этом находятся беспрестанно развратные женщины и нижние чины Слежительской роты, при самом бдительном надзоре почти ежедневно бывают в пьяном виде, а воспитанники проходя на купанье мимо этого шинка видят самый гнусный разврат, могущий иметь вредное влияние на их нравственность» [39, арк. 1]. У 1860 г. у Гродне зачынены два шынкі, якія знаходзіліся паблізу салдацкіх казарм [40, арк. 1]. У 1889 г. святар Белавежскай царквы Пружанскага ўезда М. Шырнінскі просіць улады не дазваляць яўрэю І. Лекефінду адкрываць карчму каля царквы ў вёсцы Сточак [41, арк. 1]. У 1880 г. была зачынена піцейная ўстанова, што стаяла каля царквы ў маёнтку Брэсцкай воласці [42, арк. 20]. У 1894 г. у вёсцы Вулька-Сімановіцкая ў адным будынку са школай была адкрыта карчма. У выніку было вырашана карчму перанесці ў іншае месца [43, арк. 1–9]. У 1890 г. было прынята рашэнне зачыніць карчму ў вёсцы Аляксандраўка Бельскага ўезда, таму што яна знаходзілася паблізу з праваслаўнымі могілкамі [44, арк. 6].

Адпаведна з «Уставам о питейном сборе» (1879 г.) забаранялася адчыняць піцейныя ўстановы на адлегласці бліжэй за 84 метры ад культавых устаноў і могілак. Адлегласць вызначалася ад сцяны піцейнай установы да агароджы царквы альбо могілак. Не бліжэй за 84 метры дазвалялася ставіць пункты распіцця спіртнога ад турмаў, навучальных устаноў, бальніц, гарадскіх праўленняў, этапных дамоў. Не бліжэй за 210 метраў яны адчыняліся ля фабрык і заводаў з колькасцю рабочых больш за сто чалавек, а таксама ля казарм. У гарадах забаранялася адчыняць піцейныя ўстановы на рынках і на гандлёвых радах [25, арк. 19–22].

У сувязі з развіццём чыгуначнага будаўніцтва рэгламентавалася месцаразмяшчэнне піцейных устаноў паблізу чыгуначных ветак і на ўласна чыгуначных станцыях. З аднаго боку продаж спіртнога каля чыгунак мог справакаваць трагічныя наступствы праз алкаголь. Аднак неабходнасць мець пункт харчавання пры чыгуначных станцыях тлумачылася патрэбамі пасажыраў у сілкаванні. У адпаведнасці з артыкулам «Высочайше утвержденных правил о питейной торговле» ад 1885 г. забаранялася адчыняць піцейныя ўстановы ўздоўж чыгуначных ліній, акрамя гасцініц і паштовых станцый. У месцах размяшчэння чыгуначных станцый вызначалася наступная адлегласць: для тракцірных устаноў, пастаялых двароў і корчмаў – 63 метры; для гарадской мясцовасці – 126 метраў [45, арк. 25]. У 1893 г. закон «Об устройствах разного рода заведений трактирного промысла» паўтарыў забарону адчыняць піцейныя ўстановы бліжэй за 84 метры ад храмаў і манастыроў [46, арк. 43].

Выкананне вышэйназваных законаў сустракала супярэчнасці. Так, некалькі пытанняў накіраваў упраўляючы акцызнымі зборамі Віленскай губерні ў Дэпартамент неакладных збораў. Пытанні былі наступнага зместу: 1) як быць з тымі тракцірнымі ўстановамі, якія ўжо былі адкрыты на блізкай адлегласці ад храмаў; 2) што лічыць актам адкрыцця: штогадовае абнаўленне патэнтаў ці ўласна адкрыццё піцейнай установы. Пытанні адлюстроўваюць тое, што рэалізацыя дадзенага законапраекта часам выклікала блытаніну.

У першую чаргу праблема была ў тым, якія ўстановы лічыць нанова адкрытымі. Гістарычныя крыніцы зафіксавалі наступны выпадак. У Гродне, паблізу праваслаўнага сабора, за 35 метраў ад агароджы, існавала тракцірная ўстанова больш за 30 гадоў. Катхе, яе ўладальнік, спыніў гандаль 1 студзеня 1886 г. (да выхаду закона з вызначэннем адлегласці). Аднак 8 студзеня купец Гольдберг звярнуўся да назіральніка 1-й акругі з просьбай аб выдачы яму патэнта на піцейны гандаль у той самай тракцірнай установе, якую ўтрымліваў Катхе. Упраўляючы акцызнымі зборамі палічыў, што гэтую ўстанову нельга лічыць нанова адчыненай, а невялікі прамежак часу, калі ўстанова не функцыянавала, нельга лічыць актам закрыцця. Аднак саборнае духавенства ўсяляк супрацьстаяла ўзнаўленню дзейнасці гэтага тракціра, матывавала гэта тым, што тракцір з’яўляецца нанова адкрытым і яго месцаразмяшчэнне не адпавядае законнасці [47, арк. 77].

У Гродне паўстаў шэраг пытанняў па адкрыцці тракціра пры гасцініцы «Цэнтральная», якая знаходзілася на адлегласці 42 метры ад рымска-каталіцкага касцёла. Гродзенская гарадская дума пастанавіла даць дазвол на адкрыццё тракціра з гандлем у ім спіртным. Пратэсту супраць адкрыцця тракціра не было і з боку гродзенскай паліцыі і рымска-каталіцкага дэкана. Аднак на адкрыццё тракцірнай установы пры гасцініцы не даў дазволу ўпраўляючы епархіяй. Таму гэты тракцір так і не быў адчынены [47, арк. 99].

Тракцірная ўстанова была зачынена і ў мястэчку Валынцы Віцебскай губерні. На гэтае рашэнне скардзіўся ў Міністэрства фінансаў уласнік. Са справы вядома, што гандаль ва ўстанове здзяйсняўся ў 1885 г., а ў першай палове 1886 г. быў перапынак з нагоды рамонту. У другой палове 1886 г. пасля рамонту гандаль быў адноўлены. Віцебская прысутнасць па піцейных справах палічыла ўстанову нанова адкрытай і вызначыла закрыць тракцір, бо ён знаходзіўся за 40 метраў ад агароджы царквы. Скаргі аб закрыцці тракціраў у Міністэрства фінансаў паступалі з Віцебска, Магілёва, іншых беларускіх гарадоў і мястэчак [47, арк. 26]. У 1894 г. была закрыта карчма, што размяшчалася на адлегласці 63 метраў ад манастыра ў Баркулабава [48, арк. 1–2].

Наяўнасць устаноў грамадскага харчавання закранала інтарэсы мясцовага насельніцтва. Перыядычна пункты піцейнага продажу станавіліся месцамі злачынстваў, таму часам насельніцтва пратэставала супраць такога роду ўстаноў непадалёку ад іх дамоў ці школ. Так, мясцовым сходам прадстаўлялася права на хадайніцтвы аб закрыцці піцейнай установы, калі яна нейкім чынам парушала спакойнае жыццё пэўнай тэрыторыі. У 1906 г. сяляне адной з вёсак Гродзенскай губерні выказалі пратэст супраць адкрыцця ў іх вёсцы віннай лаўкі, матывуючы гэта імкненнем супрацьдзейнічаць пашырэнню п’янства [47, арк. 13]. У сакавіку 1905 г. забаранілі дзейнасць піцейнай лаўкі сяляне вёскі Міжэвічы Гродзенскай губерні. Яны сцвярджалі, што піцейная лаўка знаходзіцца побач з жылымі дамамі, якія крытыя саломай, а наяўнасць паблізу піцейнай установы пагражае пажарам суседнім хатам [49, арк. 30].

Супраць работы піўной лаўкі ў 1904 г. выступіў Булянскі сельскі сход Гродзенскай губерні. Лаўка была адчынена паблізу са школай, і, як напісана ў прашэнні: «…вино распивается под самими окнами на виду у учеников, иногда под самыми окнами и даже около самой школы». Вяскоўцы скардзіліся, што настаўнік і вартаўнік не ў сілах справіцца з «подвившими буянами», часам справа даходзіць да боек на вачах у школьнікаў [49, арк. 23]. Былі зафіксаваны сялянскія пратэсты па прычыне размяшчэння піцейных устаноў блізу могілак. Супраць піцейнай установы выступілі сяляне вёскі Аляксандраўка Гродзенскай губерні ў 1883 г. Яны скардзіліся на тое, што яўрэй пабудаваў карчму літаральна на месцы праваслаўных могілак, дзе «…покоятся умершие предки крестьян названной деревни, на могилах которых ещё и доселе сохранились памятники-кресты» [44, арк. 6].

Рэгламентацыя рэжыму дзейнасці ўстаноў харчавання непасрэдным чынам звязвалася з гандлем спіртным. Паводле «Правил о раздробительной продаже крепких напитков» (1885 г.) продаж спіртнога дазваляўся з 7 гадзін раніцы, у сельскай мясцовасці – да 22 гадзін, а ў гарадах – да 23 гадзін [50, арк. 7]. Гандаль спіртным забараняўся падчас хрэсных хадоў, а ў нядзельныя дні – падчас літургіі. Сельскія сходы маглі забараніць гандаль спіртным у іншыя дні царкоўных святаў [51, арк. 12].

Парадак дзейнасці тракцірных устаноў замацоўваўся «Обязательным постановлением об обеспечении нормального отдыха служащих в торговых заведениях» (1892 г.). Установы, якія прадавалі стравы і напіткі для ўжытку на месцы, працавалі: а) рэстараны і тракціры – з 11 гадзін раніцы да 2-й гадзіны ночы; б) харчэўні і чайныя – з 7 гадзін раніцы да 22 гадзін; в) піўныя распівачныя лаўкі – з 8 гадзін раніцы да 23 гадзін; г) кафейні і кандытарскія – з 10 гадзін раніцы да 1-й гадзіны ночы. У гасцініцах, пастаялых дварах, корчмах гандаль дазваляўся ў любы час сутак [52, арк. 4].

З асаблівага дазволу губернатара мог павялічвацца час працы ўстановы харчавання. Пры выдачы такога дазволу ўлічвалі наступныя фактары: колькасць піцейных устаноў у пэўнай мясцовасці адпаведна колькасці жыхароў, добранадзейнасць і добрая рэпутацыя ўладальніка тракціра і іншыя акалічнасці (тэатральныя ці цыркавыя гулянні, летні сезон і г.д.) [20, арк. 17]. Так, дазвол гандляваць да гадзіны ночы замест 23-й атрымаў мінскі тракціршчык Б. Дваркоўскі. Паліцмайстар і назіральнік па акцызных зборах пры дазволе гандляваць да першай гадзіны ночы (замест 23-й) улічылі той фактар, што тракцір знаходзіўся ля чыгуначнай станцыі, і яго наведвалі пераважна работнікі чыгункі, а таксама пасажыры, што прыбывалі ў горад познімі цягнікамі [53, арк. 278]. У 1905 г. у Мінску А. Лазарэвічу было дазволена гандляваць у лаўцы не да апоўначы, а да 1-й гадзіны ночы, бо ў горадзе адбываліся цыркавыя паказы [53, арк. 230].

Цыркуляр Галоўнага Упраўлення неакладных збораў ад 1900 г. прадпісваў зачыняць у гарадах вінныя лаўкі а 18-й гадзіны вечара. З гэтага часу спыняўся гандаль спіртным ва ўсіх гарадскіх тракцірах. Права працягнуць час працы ў той ці іншай установе ў адпаведнасці з патрэбамі мясцовага насельніцтва аддавалася Упраўляючаму акцызнымі зборамі. У 1905 г. быў замацаваны час працы казённых вінных лавак: у будзённыя дні, акрамя суботы і перадсвяточных дзён, з сямі гадзін раніцы і да 20 гадзін у гарадах; у сельскай мясцовасці на працягу пяці месяцаў (красавік – жнівень) – да 20 гадзін, а ў астатні час (верасень – сакавік) – да 19 гадзін. У суботу і перадсвяточныя дні, гандаль пачынаўся, як і ў будзённыя дні – а 7-й гадзіне раніцы, а заканчваўся ў гарадах у 18 гадзін. У нядзелю і святочныя дні гандаль пачынаўся з заканчэннем боскай літургіі, у сельскай мясцовасці – з 12 гадзін раніцы і заканчваўся ва ўсіх гарадах а 17 гадзіне, у вёсках – а 15 гадзіне [54, арк. 124].

Гістарычныя крыніцы захавалі прыклады парушэнняў дадзеных законаў. У тракцірнай установе графа Патоцкага ў мястэчку Бярэзіна Барысаўскага ўезда ў 1901 г. акцызным надзорам выкрыты выпадкі продажу моцных напіткаў у незаконны час, а таксама дапушчэнне распіцця напіткаў у пакоі, што прызначаўся для прыказчыка [55, арк. 78]. У піўной Брэста наведвальнікі часта сядзелі да поўначы, пакуль паліцмайстар не выкрыў сістэматычных парушэнняў [53, арк. 7–9]. Піўная лаўка мяшчанкі Айзіковай у Брэсце рэгулярна пачынала працу раней за 8 гадзін раніцы. Пратакол быў складзены і на брэсцкага ўладальніка піўной М. Венеамінавіча, які не зачыніў сваю лаўку ў патрэбны час, «а лишь притворил дверь лавки, где находилось около 10 человек» [56, арк. 12]. У 1902 г. быў зачынены тракцір у мястэчку Дзятлава Слонімскага ўезда, так як яго арандатар І. Чучэйка рэгулярна парушаў правілы гандлю, у тым ліку своечасова не зачыняў сваю піцейную ўстанову [57, арк. 1].

У XVI–XVIII стст. арганізацыя рэкрэацыі ў корчмах і шынках была свабоднай і непадкантрольнай з’явай. Кліенты такіх устаноў самі спантанна ладзілі гульні, танцы, спевы, выступленні з удзелам мясцовых ці вандроўных музыкантаў. Асабліва гэта было характэрна для корчмаў у сельскай мясцовасці, што і дало падставы зрабіць высновы аб карчме як аб асяродку захавання народнай культуры. З другой паловы XIX ст. сітуацыя карэнным чынам змяняецца. Узнікае мноства тыпаў устаноў грамадскага харчавання, на дзяржаўным узроўні выпрацоўваецца іх класіфікацыя з пэўнымі патрабаваннямі для кожнага з тыпаў, дзейнасць якіх неабходна было ўніфікаваць. Пад кантроль і рэгламентацыю падпадае і сфера рэкрэацыі, якая пачынае лічыцца адным з важных элементаў дзейнасці ўстаноў тракцірнага промыслу, набывае самастойнае значэнне, у тым ліку фінансавае, так як арганізацыя дадатковых забаў (гульні, музыка) прываблівала кліентаў, а значыць і прыносіла ўстанове дадатковы прыбытак.

Рэгламентацыя сферы забаўляльных мерапрыемстваў была абумоўлена імкненнем захоўваць парадак і спакой ва ўстановах тракціранага промыслу. Для карчмы, дзе такія праяўленні народнай вясёласці былі натуральнай і неад’емнай з’явай, гэта мела, безумоўна, адмоўны эфект. Карчма губляла сваё адметнае і самабытнае аблічча, станавілася падкантрольнай установай. Пералік забаўляльных мерапрыемстваў ва ўстановах тракцірнага промыслу не быў шырокім: музычная праграма, більярд, ігравыя прыстасаванні, музычныя скрыні. Была сфера і самаарганізаваных асяродкаў: гульні ў шашкі, шахматы, косці і карты [30, арк. 2–3].

У «Положении о трактирных заведениях» (1861 г.) зафіксаваны дазвол на ўстаноўку більярда ў тракцірных установах і прымальных законам гульняў і музыкі [24, арк. 14]. Дазвол на арганізацыю забаў быў у кампетэнцыі губернатара. «Уставом о питейном сборе» (1879 г.) забаранялася арганізацыя забаўляльных гульняў (карты, косці, шашкі) і музыкі ва ўстановах, прызначаных выключна для продажу алкагольных напіткаў [25, арк. 20–36]. У 1893 г. «Положение о трактирном промысле» замацавала права губернатараў даваць дазвол на арганізацыю ва ўстановах тракцірнага промыслу забаўляльных мерапрыемстваў і гульняў [44, арк. 21].

Сярод гістарычных крыніц шматлікімі з'яўляюцца прашэнні на ўстаноўку більярда, што можна было арганізаваць са спецыяльнага дазволу і пры ўмове, што тракцірная ўстанова адпавядала наступным патрабаванням: наяўнасць кліентуры з высокім дастаткам, даволі прасторнае памяшканне. Група крыніц дапамагае выявіць працэдуру ўстаноўкі більярда: пасля таго як у органы губернскага кіравання паступала прашэнне на ўстаноўку більярда, праводзілася праверка на адпаведнасць памяшкання неабходным нормам.

Атрымаць дазвол на більярд было даволі складана. Так, жыхарка Мінска Ф. Сабалеўская змагла атрымаць дазвол на гэтую гульню, так як памяшканне яе тракцірнай установы адпавядала ўсім нормам, як і было запісана ў пратаколе агляду: «…в трактире имеется три комнаты: буфетная 8 на 10 аршинов, столовая 8 на 5 аршинов и биллиардная 8 на 9 аршинов. Все комнаты выходят окнами на улицу, и всё помещение отвечает требованиям обязательного постановления по этому делу» [58, арк. 6]. Цеснае памяшканне магло стаць прычынай адмовы на ўстаноўку більярда. Адмовы траплялiся часта, пры гэтым у іх агаворвалася прычына: «…пивную посещают лица среднего класса населения, изредка простонародье, в пивной продаётся горячая пища, больше мясные блюда, но открыть биллиардную игру было бы не желательно, в виду маломерности комнаты, предложенною для этого» [58, арк. 23]. Не заўсёды афіцыйная адмова на ўстаноўку більярда спыняла ахвотных тое зрабіць. Некаторыя браліся пераўсталёўваць тракцір і прасілі дазвол на більярд: «Ныне отделав и увеличив помещение под означенную пивную лавку, я беру смелость вновь беспокоить и почтительнейше просить Ваше Превосходительство не признаете ли вы возможным разрешить мне биллиард в своей пивной лавке» [59, арк. 78]. Наяўнасць більярда прываблівала дадатковую публіку, што спрыяла павышэнню выручкі. Часам гаспадары тракцірных устаноў праяўлялі фантазію ў арганізацыі іншых гульняў. У Рагачове, ва ўстанове двараніна К. Зянькевіча, у 1899 г. папулярнай стала гульня «фортунка» [59, арк. 10].

Вялікую папулярнасць у канцы XIX – пачатку XX стст. набылі музычныя скрынкі, на ўсталяванне якіх таксама даводзілася браць дазвол у губернатара [60, арк. 179]. Часам у рэстаранах былі арганізаваны аркестры з мясцовых музыкантаў. Так, у рэстаране горада Кобрына ў 1897 г. аркестр выступаў два разы на тыдзень [57, арк. 70]. Вядома, што ў 1882 г. у рэстаране В. Чапскага для публікі гралі арфісткі [60, арк. 1–2].

Рэгламентацыя паводзін наведвальнікаў тракцірных устаноў праявілася як у агульных патрабаваннях да іх, так і ў адрасаваных да канкрэтных катэгорый кліентаў: ваенных служачых, навучэнцаў, чыноўнікаў. Да агульных патрабаванняў адносіліся: забарона прыходзіць у тракцірныя ўстановы ў п'яным і неахайным выглядзе, гучна спрачацца і арганізоўваць бойкі, гуляць у азартныя гульні.

Сярод публікі тракцірных устаноў былі салдаты ніжніх воінскіх чыноў. «Устав о питейном сборе» (1879 г.) забараняў упускаць ва ўстановы піцейнага промыслу служачых ніжэйшых воінскіх чыноў, што знаходзіліся пры выкананні абавязкаў. Не дазвалялася такім асобам знаходзіцца ў піцейных установах падчас адпачынку пры нашэнні форменнай вопраткі [25, арк. 163]. Ставілася мэта не дапускаць іх да разгулу, трымаць у строгай ваеннай дысцыпліне, прадухіляць магчымыя беспарадкі, якія маглі ствараць падвыпіўшыя служачыя. Салдаты часам парушалі забарону наведваць тракціры ды яшчэ і здзяйснялі злачынствы. У 1874 г. камандзір М. Васечкін вынес з піцейнай установы ў Беластоку куфар з асабістымі рэчамі карчмара [61, арк. 12]. З рапарта паліцмайстра на імя гродзенскага губернатара ад 1876 г. становіцца вядома аб выпадку, калі сем ваенных служачых уварваліся ў піцейную ўстанову яўрэя Крынскага, разбілі шыбы ў вокнах і вынеслі некалькі бутэлек гарэлкі [62, арк. 11].

Адным з парушэнняў воінскай дысцыпліны было наведванне піцейных устаноў уначы і правядзенне вольнага часу з жанчынамі лёгкіх паводзін. Аб адным з такіх выпадкаў засведчыў паліцэйскі надзірацель горада Брэста, які падчас абыходу выкрыў адчыненую піўную лаўку па-за рамкамі адведзенага часу. У той лаўцы сядзелі салдаты і пілі піва [63, арк. 7–9]. Рэпутацыю публічнай установы, куды прыходзілі салдаты разам з жанчынамі самай старажытнай прафесіі, атрымаў тракцір яўрэйкі Давыдавай у Брэсце [64, арк. 3]. Крыніцы выяўляюць выпадкі крадзяжоў, якія чыніліся салдатамі. Так, у 1834 г. была заведзена судовая справа на радавых Вялікалуцкага егерскага палка М. Пятрова і В. Курачкіна за пакражу некаторых рэчаў з карчмы ў Навагрудку [65, арк. 2]. Адной з прычын абмежавання наведвання ўстаноў грамадскага харчавання ніжнімі воінскімі чынамі была неабходнасць барацьбы супраць алкагалізму ў асяроддзі салдат. Па меркаванні М. Шыпава, аўтара кнігі «Алкоголизм и революция», алкаголь зніжаў энергію і вынослівасць салдата, яго здольнасць пераносіць моцную гарачыню, затармозваў баявую гатоўнасць войска, так як спіртныя напіткі пагаршалі пільнасць і меткасць салдата [66].

Забаранялася наведваць тракцірныя ўстановы навучэнцам гімназій. У 1890 г. Міністэрствам народнай Асветы былі апублікаваны «Правила для учеников гимназий и прогимназий ведомства Министерства Народного Просвещения». У параграфе 36 замацоўвалася наступнае: «Ученикам гимназий и прогимназий безусловно и строжайше запрещается посещать маскарады, клубы, трактиры, кофейни, кондитерские, бильярдные и другие подобные заведения, а равного рода публичные и увеселительные места, посещение коих будет опасным и неприличным для учеников» [67, арк. 5].

Лічылася, што наведванне моладдзю піцейных устаноў вядзе да яе дэмаралізацыі. На паліцыю ўскладваўся абавязак сачыць не толькі за тым, каб у піцейных установах не было салдат, але і навучэнцаў. Часам кіраўніцтва навучальных устаноў звярталася да губернатараў з просьбаю зрабіць адпаведнае распараджэнне. Так, дырэктар Магілёўскай гімназіі звярнуўся да губернатара з просьбаю зрабіць распараджэнне ўладальнікам піцейных устаноў даць распіскі аб тым, што яны не будуць упускаць у свае ўстановы гімназістаў, а паліцыі даць распараджэнне, каб яна назірала за выкананнем гэтай распіскі [68, арк. 1–7]. За дапушчэнне навучэнцаў гімназій у піцейныю ўстанову прадугледжвалася яе закрыццё [59, арк. 53].

Хоць чыноўнікам не забаранялася наведваць тракцірныя ўстановы, але для гэтай групы кліентаў існавала асаблівае прадпісанне – не гуляць у азартныя гульні, асабліва ў карты [69, арк. 2–3]. Лічылася, што наведванне чыноўнікамі піцейных устаноў прыносіць шкоду і не спрыяе сумленнаму выкананню службовых абавязкаў. За выяўленне выпадкаў правядзення часу за азартнмі гульнямі прадпісвалася звальненне з пасады [70, арк. 53].

Арганізацыя кантролю і нагляду за функцыянаваннем устаноў харчавання ўскладалася на паліцыю, якая адсочвала парушэнні, кантралявала ход выканання дзеючага агульнадзяржаўнага заканадаўства і мясцовых (губернскіх) нарматыўных актаў, выкрывала і прадухіляла безакцызны продаж спіртнога, кантралявала паводзіны наведвальнікаў тракцірных устаноў і вышуквала там беглых. Дзейнасць паліцыі па нагляду за выкананнем заканадаўства абмяжоўвалася рэйдамі і даносамі, вынясеннем папярэджанняў.

У 1862 г. была распрацавана «Инструкция полициям об обязанностях их по питейному сбору» [71, арк. 19–26]. Інструкцыя замацоўвала агульныя абавязкі паліцыі па назіранні за ўстановамі, дзе выраблялiся і прадаваліся спіртныя напіткі. Да агульных абавязкаў паліцыі адносілася назіранне за выкананнем правілаў гандлем спіртным. Пры выяўленні выпадкаў парушэнняў правярала і праводзіла дазнанні, штрафавала [71, арк. 9]. Ідэалагічна дзейнасць паліцыі афарбоўвалася ў неабходнасць абараняць інтарэсы казны, а менавіта наглядаць за тымі месцамі гандлю, дзе няма асобнай гандлёвай паліцыі і выяўляць выпадкі гандлю па падробным патэнтам. Паліцыя таксама адсочвала, каб спіртное прадавалі ў закаркаваным посудзе з абазначэннем назвы напітка, а ўстановы, дзе праводзіцца гандаль спіртным, мелі спецыяльныя шыльды [53, арк. 7].

Паліцыя ажыццяўляла дадзеныя меры шляхам асабістага наведвання і агляду, збору інфармацыі, прыняццем скаргаў і даносаў, праводзіла следствы, дазнанні, разбірацельствы. Губернатар патрабаваў ад паліцыі садзейнічаць чынам акцызнага надзору [72, арк. 235]. Паліцыя адсочвала выпадкі тайнага безакцызнага гандлю спіртным. Важнай функцыяй паліцыі была праверка дабранадзейнасці асоб, якія кіравалі заводамі па вырабу спіртнога ці ўстановамі грамадскага харчавання з правам гандлю спіртнымі напіткамі [73, арк.1].

Згодна з інструкцыяй паліцыя сачыла за наяўнасцю шыльдаў, за тым, каб сярод работнікаў піцейных устаноў не было людзей з інфекцыйнымі захворваннямі або былых злачынцаў, выяўляла палітычную дабранадзейнасць уласнікаў тракціраў: «полиция наблюдает, чтобы в заведениях, где продаются напитки, сии последние не содержались в такой посуде, употребление которой воспрещено в видах охранения народного здравия, чтобы в сих заведениях не были в услужении лица, одержимые прилипчивыми болезнями, и чтобы ни в сих заведениях, ни на заводах не были продаваемы напитки с вредною для здоровья примесью» [71, арк. 19]. За выкрыццё незаконных дзеянняў з боку карчмароў паліцэйскім выдавалася прэмія [73, арк. 126, 157, 197].

Заключэнне. На працягу першай паловы XIX ст. галоўным фактарам, які паўплываў на фарміраванне сістэмы грамадскага харчавання стаў палітычны, абумоўлены ўваходам беларускіх зямель у склад Расійскай Імперыі. У сувязі з гэтым сфера грамадскага харчавання падпадае пад рэгламентацыю з боку новага заканадаўчага корпусу і трансфармуецца пад уплывам эканамічных і сацыяльных умоваў існавання ў складзе Расійскай Імперыі. Абагульняюцца і выпрацоўваюцца новыя законы, вызначаюцца кампетэнцыі органаў кіравання і нагляду над дадзенай сферай. Губернскія органы ўлады з’яўляліся транслятарамі агульнадзяржаўнай палітыкі адносна дзейнасці ўстаноў харчавання. Шырокія паўнамоцтвы меў губернатар, які мог выдаваць мясцовыя нарматыўна-прававыя акты адносна ўстаноў харчавання, рэгуляваць парадак іх адкрыцця і закрыцця. Губернскае праўленне, якое кіравала ўстановамі харчавання, таксама адсочвала выкананне законаў адносна іх дзейнасці. Акцызнае ўпраўленне здзяйсняла падатковую палітыку дзяржавы адносна піцейных устаноў. Шырокія паўнамоцтвы мелі і гарадскія

думы, якія ў «Абавязковых пастановах» замацоўвалі парадак дзейнасці ўстаноў харчавання. Функцыі кантролю былі ўскладзены на паліцыю. Асноўныя законы першай паловы XIX ст., якія рэгламентавалі дзейнасць устаноў харчавання – «Правила о продаже горячих напитков» (1842 г.) і «Положение об акцизе с заведений и мест раздробительной продажи горячих напитков» (1843 г.). Названыя законы рэгламентавалі парадак вызначэння коштаў на алкаголь і прадукты харчавання, абумоўлівалі парадак накладання штрафаў за парушэнні, рэгламентавалі час дзейнасці піцейных устаноў у розных мясцовасцях, вызначалі класіфікацыю тыпаў устаноў харчавання.

Законы другой паловы XIX – пач. XX стст. былі накіраваныя на стандартазацыю дзейнасці мноства тыпаў устаноў грамадскага харчавання. З законаў агульнадзяржаўнага дзеяння адзначанага перыяду абавязковаму выкананню падлягалі наступныя: «Положение о питейном сборе» (1861 г.), «Положение о трактирных заведениях» (1861 г.), «Устав о питейном сборе» (1879 г.), «Правила о раздробительной продаже крепких напитков» (1885 г.), «Положение о трактирном промысле» (1893 г.). Заканадаўства другой паловы XIX ст. было накіравана на выпрацоўку санітарна-гігіенічных патрабаванняў да ўтрымання азначаных устаноў харчавання, рэгламентацыю знешняй і ўнутранай атрыбутыкі і асноўных патрабаванняў да інтэр'еру і экстэр'еру, упарадкаванне лакалізацыі ўстаноў харчавання ў гарадах і сельскай мясцовасці, рэгламентацыю часу дзейнасці і сферы рэкрэацыі, прыняцце мераў па рэгламентацыі паводзінаў кліентаў піцейных устаноў. Прадпісанні ў сферы санітарыі былі мерапрыемствамі, накіраванымі на абарону правоў спажыўцоў, гарантаванне якаснай ежы, перасцярогу ад магчымых захворванняў па прычыне неналежнага ўтрымання ўстановы харчавання і неналежнай гігіене яе работнікаў. За антысанітарыю і наяўнасць інфекцыйных захворванняў у работнікаў тракцірнай установы нёс адказнасць уласнік тракціра.

Рэгламентацыя інтэр'еру і экстэр'еру стала сведчаннем працэсу ўніфікацыі дзейнасці ўстаноў харчавання, яе падпарадкавання стандартызаваным нормам. Рэгламентацыя лакалізацыі ўстаноў харчавання на мясцовасці залежала ад шчыльнасці насельніцтва, тыпу мясцовасці (гарадская альбо сельская), аддаленасці ад культавых і адукацыйных арганізацый, заводаў і фабрык, вайсковых фарміраванняў. Установы грамадскага харчавання сталі часткаю рэкрэацыйнай сферы гарадоў. Арганізацыя розных забаў і гульняў пачала насіць не столькі рэкрэацыйны характар, як гэта было раней, а камерцыйны, таму таксама падлягала строгай рэгламентацыі на аснове закона. З'яўляюцца асаблівыя прадпісанні аб правілах паводзінаў ва ўстановах харчавання. Так, забаранялася прыходзіць у такія ўстановы ў п'яным ці неахайным выглядзе, забаранялася спрачацца, ладзіць бойкі і арганізоўваць азартныя гульні. У другой палове XIX – пач. XX стст. ва ўстановах харчавання часта адбываліся крымінальныя здарэнні і выказваліся антыўладныя і антыцарскія ідэі, што абумовіла шырокія функцыі паліцыі ў сферы кантролю за дзейнасцю ўстаноў грамадскага харчавання: нагляд, кантроль, вышук і выслежванне злачынцаў.

Да пачатку XX ст. дзейнасць сістэмы грамадскага харчавання падпала пад грунтоўную рэгламентацыю і кантроль з боку дзяржавы. З аднаго боку гэта сведчыла аб тым, што ўстановы харчавання сталі адыгрываць важную ролю ў эканамічным і сацыяльным жыцці насельніцтва таго часу, складаць значную частку яго штодзённага жыцця і рэкрэацыі. З іншага боку, дзейнасць пунктаў харчавання цесным чынам перапляталася з продажам спіртнога, доход ад якога дзяржава здаўна імкнулася манапалізаваць. Таксама праз пільную рэгламентацыю дзейнасці такіх устаноў дзяржава хацела кантраляваць і само грамадства, што ў выніку прывяло да шырокіх функцый паліцыі ў справе адсочвання парушэнняў, выкрыцця злачынстваў, разгляду даносаў і інш. Адносіны дзяржавы да ўстаноў харчавання мелі супярэчлівы характар, і аптымальны варыянт кіравання сістэмай харчавання так і не быў выпрацаваны да канца даследуемага перыяду.

ЛІТАРАТУРА


1. Батура, А. А. Грамадскае харчаванне / А. А. Батура // Беларус. энцыкл. : у 18 т. – Мінск, 1997. – Т. 5. – С. 397.
2. Швед, В. Торговля в Беларуси в период кризиса феодализма (1830–1850-е гг.) / В. Швед. – Гродно: Орбикс, 1995. – 195 с.
3. Якімовіч, Ю. Я. Драўлянае дойлідства Беларускага Палесся XVII–XIX стст. / Ю. Я. Якімовіч. –Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 149 с.
4. Якімовіч, Ю. Я. Карчма / Ю. Я. Якімовіч // Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1989. – С. 525.
5. Сергачев, С. А. Белорусское народное зодчество / С. А. Сергачев. – Минск : Ураджай, 1992. – 255 с.
6. Сергачев, С. Заезжая корчма в Беларуси / С. Сергачев // Архитектура и стр-во. – 2005. – № 6. – С. 20–23.
7. Сардаров, А. Придорожная гостиница в Беларуси (от корчмы до мотеля) / А. Сардаров // Архитектура и стр-во. – 2005. – № 6. – С. 21–26.
8. Сергачоў, С. Карчма ў Гарадзішчы / С. Сергачоў // Беларус. мінуўшчына. – 1996. – № 3. – С. 51–53.
9. Сардаров, А. С. Путетворение: история и культура белорусских дорог / А. С. Сардаров. – Минск : Беларус. навука, 2009. – 191 с.
10. Смолік, А. Карчма як прастора вуснай народнай творчасці / А. Смолік // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зб. навук. пр. удзельнікаў V Міжнар. навук. канф., Мінск, 29 крас. – 1 мая

2011 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: М. А. Мажэйка (старш.), В. В. Калацэй, С. К. Кананoвіч. – Мінск, 2011. – С. 23–25.
11. Швед, В. Карчма – заезны дом для падарожнікаў (XIV – пачатак XX ст.) / В. Швед // Nowe wyzwaniagospodarki turystycznej na poziomie lokalnym, regionalnym i miedzynarodowym. – Bialystok, 2011. – С. 69.
12. Лобач, У. Карчма ў беларускай этнакультурнай традыцыі: сімвалічны статус і рытуальныя функцыі / У. Лобач // Беларус. гіст. часоп. – 2011. – № 3. – С. 15–19.
13. Насевіч, В. Дэмаграфія, заселенасць / В. Насевіч // Вялікае княства Літоўскае : ВКЛ : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – 2-е выд. – Мінск, 2007. – Т. 1. – С. 55.
14. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветных цывілізацый : вучэб. дапам. / В. І. Галубовіч і інш. ; пад рэд. В. І. Галубовіча, Ю. М. Бохана. – 4-е выд. – Мінск : Экаперспектыва, 2009. – 477 с.
15. Статут Великого Княжества Литовского 1529 года / Акад. наук Белорус. ССР, Отд. правовых наук; под ред. К. И. Яблонскиса. – Минск : Изд-во Акад. наук БССР, 1960. – 253 с.
16. Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года / [Т. І. Доўнар, У. М. Сатолін, А. Я. Юхо] ; рэдкал.: Т. М. Доўнар [і інш.]. – Мінск : Тэсей, 2003. – 250 с.
17. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г. / пер. на беларус. мову А. С. Шагун. – Мінск : Беларусь, 2002. – 207 с.
18. Устава на валокі // Спадчына. – 1993. – № 4. – С. 63–78.
19. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі ; рэдкал.: Г. Я. Галенчанка [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – Кн. 43 : Кніга запісаў (1523–1560) : копія канца XVI ст. / падрыхт. В. С. Мянжынскі. – 167 с.
20. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Мінск (далей – НГАБ (г. Мінск)). – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1478.
21. НГАБ (г. Мінск). – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 1833.
22. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (далей – НГАБ (г. Гродна)). – Ф. 30. Воп. 1. Спр. 1.
23. НГАБ (г. Гродна). – Ф. 2. Воп. 3. Спр. 1919.
24. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў у г. Санкт-Пецярбург (далей – РДГА). – Ф. 574. Воп. 1. Спр. 4.
25. РДГА. – Ф. 1609. Воп. 1. Спр. 227.
26. РДГА. – Ф. 574. Воп. 9. Спр. 94.
27. РДГА. – Ф. 574. Воп. 9. Спр. 22.
28. НГАБ (г. Мінск). – Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 237.
29. НГАБ (г. Гродна). – Ф. 1. Воп. 17. Спр. 838.
30. НГАБ (г. Гродна). – Ф. 17. Воп. 1. Спр. 48.
31. НГАБ (г. Гродна). – Ф. 1564. Воп. 1. Спр. 11.
32. НГАБ (г. Мінск). – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 7388.
33. НГАБ (г. Мінск). – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 784.
34. НГАБ (г. Гродна). – Ф. 117. Воп. 1. Спр. 1.
35. НГАБ (г. Мінск). – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 1834.
36. НГАБ (г. Гродна). – Ф.1. Воп. 9. Спр. 848.
37. НГАБ (г. Гродна). – Ф. 301. Воп. 1. Спр. 4.
38. РДГА. – Ф. 574. Воп. 1. Спр. 4.
39. НГАБ (г. Мінск). – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 3088.
40. НГАБ (г. Гродна). – Ф. 1. Воп. 13. Спр. 454.
41. НГАБ (г. Гродна). – Ф. 2. Воп. 34. Спр. 1524.
42. НГАБ (г. Гродна). – Ф. 1. Воп. 8. Спр. 2298.
43. НГАБ (г. Гродна). – Ф. 2. Воп. 13. Спр. 41.
44. НГАБ (г. Гродна). – Ф. 1. Воп. 9. Спр. 313.
45. НГАБ (г. Гродна). – Ф. 2. Воп. 13. Спр. 327.
46. РДГА. – Ф. 574. Воп. 9. Спр. 1017.
47. РДГА. – Ф. 574. Воп. 9. Спр. 29.
48. РДГА. – Ф. 574. Воп. 9. Спр. 1006.
49. НГАБ (г. Мінск). – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 1506.
50. НГАБ (г. Гродна). – Ф. 18. Воп. 4. Спр. 70.
51. НГАБ (г. Мінск). – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 4926.
52. НГАБ (г. Гродна). – Ф. 1. Воп. 8. Спр. 1815.
53. НГАБ (г. Гродна). – Ф. 174. Воп. 1. Спр. 85.
54. НГАБ (г. Мінск). – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 7528.
55. НГАБ (г. Мінск). – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 7529.
56. НГАБ (г. Мінск). – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 6975.
57. НГАБ (г. Гродна). – Ф. 674. Воп. 1. Спр. 85.
58. НГАБ (г. Гродна). – Ф. 1. Воп. 9. Спр. 1542.
59. НГАБ (г. Мінск). – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 1962.
60. НГАБ (г. Мінск). – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 1795.
61. НГАБ (г. Гродна). – Ф. 1. Воп. 9. Спр. 669.
62. НГАБ (г. Гродна). – Ф. 1. Воп. 15. Спр. 349.
63. НГАБ (г. Гродна). – Ф. 1. Воп. 15. Спр. 1156.
64. НГАБ (г. Гродна). – Ф. 1. Воп. 9. Спр. 816.
65. НГАБ (г. Гродна). – Ф. 1. Воп. 2. Спр. 1072.

66. НГАБ (г. Гродна). – Ф. 1. Воп. 10. Спр. 1287.
67. Шипов, Н. Н. Алкоголизм и революция [Электронный ресурс] / Н. Н. Шипов // Библиотека Гумер. – Режим доступа: http://www.gumer.info/bibliotek_Buks/History/Article/shipov_rev.php. – Дата доступа: 21.03.2013.
68. НГАБ (г. Гродна). – Ф. 1. Воп. 7. Спр. 1078.
69. НГАБ (г. Мінск). – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 1021.
70. НГАБ (г. Гродна). – Ф. 1. Воп. 28. Спр. 373.
71. НГАБ (г. Гродна). – Ф. 30. Воп. 1. Спр. 479.
72. НГАБ (г. Гродна). – Ф. 1. Воп. 6. Спр. 255.
73. НГАБ (г. Гродна). – Ф. 1. Воп. 8. Спр. 2125.

*Пастyпiў 3.11.15*

## THE DIRECTIONS OF LEGISLATIVE REGULATION OF THE ACTIVITIES OF CATERING ESTABLISHMENTS IN THE LATE XVIII – EARLY XX CENTURIES ON THE TERRITORY OF BELARUS

***L. VIKOL***

*We considered the main directions of the legislative and legal regulation of the activity of catering institutions in the late XVIIIth – early XXth centuries on the territory of Belarus. Legislative regulation is divided into two phases within the framework of delineated history. On the first stage (the end of XVIIIth - first half of the XIX th century) catering developed under the influence of the political factor related with including the territory of Belarus into the Russian Empire. At this time, there happened an adaptation of the activity of catering to the all-Russian standards. On the second phase (second half of the XIXth – early XXth centuries) the details of hygienic requirements to the maintenance of the institutions are defined, external and internal attributes were unified. Regulations are subjected to the organization of recreation, localization of food establishments on the terrain, social structure of their visitors and their mode. The role of police is traced in the ensuring the legitimate activities of food locations.*

***Keywords****: catering, food establishment, regulation and control activities, the Grand Duchy of Lithuania, the Russian Empire.*